**УДК 340.1(4)«04/14»**

# ФАРМІРАВАННЕ РАННЕСЯРЭДНЯВЕЧНЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ УТВАРЭННЯЎ НА ЗЕМЛЯХ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ (АГУЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ)

***Ю.М. КЕЖА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Аналізуюцца асноўныя фактары, якія прыводзяць да канчатковага афармлення раннесярэднявечных дзяржаўных утварэняў на землях Усходняй Еўропы (канец X – пачатак XI ст.). На тэррыторыях утвораных дзяржаў-княстваў паступова сціраюцца былыя этнічныя межы, а самі дзяржаўныя ўтварэнні на чале з вярхоўнай княжацкай уладай выступаюць у ролі своеасабовага "плавільнага катла", фарміруючы адзіную сацыяльна- палітычную, эканамічную і культурную прастору пад кіраўніцтвам уласных дынастый. Ідэалагічнай асновай дзяржаўных аб'яднанняў становіцца хрысціянская царква.*

***Ключавыя словы**: дзяржаўныя ўтварэнні, княжацкая ўлада, хрысціянства, культурная прастора.*

**Уводзіны.** Сацыяльна-палітычныя, эканамічныя, духоўныя і рэлігійныя пераўтварэнні, якія адбываліся на землях Усходняй Еўропы ў канцы X – пачатку XI стст., непасрэдным чынам адлюстроўваюць новы этап у эвалюцыі і развіцці дзяржаўнасці на тэрыторыі некалі заселенай усходнеславянскімі племяннымі аб'яднаннямі, балцкімі і фіна-угорскімі плямёнамі.

Перыяд другой паловы – канца IX–X стст. характарызаваўся зараджэннем і паступовым развіццём протадзяржаўных (патэстарных) утварэнняў, звязаных з дзейнасцю ваенізаваных дружын на чале з правадырамі. Князі разам з дружынамі забяспечвалі і падмацоўвалі сваё сацыяльнае ўзвышэнне над асноўнай часткай грамадства шляхам ваенных рабаўнічых паходаў, кантролем над стратэгічнымі кропкамі трансеўрапейскіх гандлёвых шляхоў і зборам даніны ў выглядзе палюддзя з падуладных зямель. У сваю чаргу канец X – пачатак XI стст. адзначаны пэўнымі зменамі ў грамадскім жыцці і канчатковым фарміраваннем раннесярэднявечных дзяржаў, Полацкай зямлі і Кіеўскай дзяржавы на землях ранейшых усходнеславянскіх племянных саюзаў.

Пры вызначэнні паняцця "дзяржава" існуюць мноства розных падыходаў і трактовак, якія, у залежнасці ад разглядаемага прадмета даследавання, вызначаюцца сацыяльна-эканамічнымі, палітычнымі, ці цывілізацыйнымі фактарамі. Згодна з даследваннямі апошніх 10 гадоў, прысвечаных генезісу старажытнарускай дзяржаўнасці, увагі заслугоўвае вызначэнне паняцця "дзяржава", прапанаванае беларускім гісторыкам С.М. Цемушавым. "Дзяржава – заканамерна ўзнікшы на пэўнай стадыі гістарычнага развіцця орган кіравання, які забяспечвае цэласнасць сацыяльнага арганізма, яго нармальнае функцыянаванне і ўзнаўленне, абарону ад знешняй і ўнутранай пагрозы" [1, с. 77].

Калі цалкам пагадзіцца з даследчыкам, то пад паняцце "дзяржава" ў гэтым сэнсе падыходзяць дадзяржаўныя племянныя саюзы VIII–IX стст., якія безумоўна мелі пэўны орган кіравання ў выглядзе ўлады племянных правадыроў і старэйшын, народнага сходу. Дадзеныя органы кіравання так ці інакш пасродкам ажыццяўляемай улады падтрымлівалі "грамадскае адзінства" і "нармальнае функцыянаванне" грамадства. Адной з галоўных функцый як племянных князёў, так і князёў больш позняга перыяду, з'яўлялася абарона падуладнага грамадства ад знешняй пагрозы, што і абумовіла фарміраванне легітымнасці пануючай улады. Такім чынам, наяўнасць улады як такой, і яе грамадскае прызнанне выключнымі прыкметамі дзяржавы не з'яўляюцца.

Пры гэтым варта адзначыць, што С.М. Цемушаў, у артыкуле "Роля кіруючых дынастый у развіцці ранніх славянскіх дзяржаў" абсалютна справядліва адзначае выключную ролю асобных дынастый у працэсе фарміравання і развіцця раннефеадальных дзяржаўных утварэнняў [2, с. 278–282].

Больш дакладным з'яўляецца вызначэнне паняцця "дзяржава", прапанаванае Я.А. Юхо. "Дзяржава – гэта тэрытарыяльны, суверэнны хаўрус грамадзянаў, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды і маёмасці. Яе дзейнасць рэгламентуецца прававымі нормамі і правіламі маральных паводзін, выкананне якіх забяспечваецца сістэмай кіравання і выхавання" [3, с. 5]. Але на наш погляд пры дадзенай трактоўцы і разуменні дзяржавы таксама не ўлічваюцца вызначальныя рысы, якія ўжо не характэрны для грамадстваў, якія знаходзяцца на родапляменным этапе развіцця і стадыі патэстарных утварэнняў, а менавіта: размяшчэнне насельніцтва па тэрытарыяльнай прыкмеце (на што звярнуў увагу Г.В. Штыхаў) [4, с. 8], наяўнасць дзяржаўнага апарата кіравання і сацыяльна-палітычных інстытутаў, зафіксаваныя зводы законаў, якія рэгулююць грамадскае жыццё. Да гэтага, пры даследаванні генезіса і станаўлення раннефеадальных дзяржаў таксама варта вылучыць наяўнасць правячай дынастыі, якая валодае манапольным правам улады над насельніцтвам на падпарадкаванай тэрыторыі [5].

Такім чынам, мы прапануем сваё бачанне характэрных рыс, якія з’яўлюцца паказчыкам існавання і развіцця раннесярэднявечных дзяржаў, і прапануем вызначэнне дзяржавы, як *заснаванай па тэрытарыяльнай прыкмеце ўладна-палітычнай арганізацыі, якая валодае апаратам кіравання і прымусу, характарызуецца наяўнасцю сацыяльна-палітычных інстытутаў і пісьмова зафіксаваных норм права, якія рэгулююць агульнаграмадске жыццё.*

Калі ўлічваць дадзеныя базавыя рысы, дзяржавы на тэрыторыі Усходняй Еўропы ад возера Ільмень да ніжняга цячэння Дняпра з поўначы на поўдзень і ад Панямоння да Сярэдняй Волгі з захаду на ўсход, канчаткова фарміруюцца ў канцы X – пачатку XI стст. Да гэтуль весці размову пра дзяржавы, як складаныя палітычныя арганізмы кіравання, звязаныя з манапольным і выключным правам на ўладу пэўнай дынастыі і яе дакладна акрэсленай тэрытарыяльнай прывязкай, з вызначанымі тэрытарыяльнымі межамі, не прыходзіцца.

**Асноўная частка.** Пры разглядзе і параўнанні аснавапаложнай ролі князёў і дружын канца IX–X стст. у паступовым складванні дзяржаўных утварэнняў з перыядам канца X–XI стст., іх асноўныя функцыі, якія палягалі ў абароне і ахове насельніцтва, зборы падаткаў і забяспячэнні стабільнага развіцця грамадства, кардынальна не змяніліся. Але варта прызнаць, што дадзеныя функцыі памножыліся і ўскладніліся [6, с. 514].

Таксама прынцыпова змяніўся сам характар вярхоўнай княжацкай улады. У ранейшы перыяд функцыянаванне княжацкай улады і дзейнасць асобных кіеўскіх князёў – Алега, Ігара, Святаслава – былі абумоўлены сістэмай каштоўнасцей і агульнымі ўяленнямі дахрысціянскага характару. Гэтая сістэма ўяўленняў палягала ў праслаўленні асобнага князя і яго дружыны, іх узбагачэння. Дадзеных рэчаў можна было дасягнуць толькі шляхам шматразовых авантурных ваенных выпраў на значныя адлегласці.

У гэтым сэнсе ваяўнічыя паходы Алега і Ігара на Канстанцінопаль у 907, 941, 944 гг., ваяўнічыя выправы Святаслава на Балканы ў 967–970-х гг. (са спробай перанесці сталіцу Русі ў Пераяславец на Дунаі), ваенныя паходы з мэтай накладання даніны на ўсходнеславянскія племянныя саюзы, нефіксаваны і нерэгламентаваны збор даніны з гэтых плямёнаў (што асабліва паказальна на прыкладзе Ігара) не ўмацоўвалі ўнутранае становішча князёў у падуладных землях [7, с. 59].

На падобныя з’явы, характэрныя для тэрыторый Усходняй Еўропы пры пераходзе ад племянных утварэнняў да раннедзяржаўнай арганізацыі, звяртае ўвагу польскі даследчык Л. Слупецкі. Паводле яго высноў асноўнымі крыніцмі даходаў прадстаўнікоў улады ў гэты час з’яўляліся: збор даніны, гандаль людзьмі (рабамі, ваеннапалоннымі), добра арганізаванае рабаванне падуладнага насельніцтва і прылеглых тэрыторый. Як адзначае даследчык: “Здаецца, такія паводзіны тыповы хутчэй для банды злачынцаў, чым для рэспублікі (res publica)” [8, с. 250]. Варта адзначыць, што дадзеная сістэма, характэрная для раннесярэднявечных варварскіх каралеўств V–VII стст., таксама цалкам адпавядае ранней гісторыі Русі з другой паловы IX да апошняй чвэрці X стст.

Князі ў чацьвёртым пакаленні ад Рурыка (70–80-я гг. X ст. – пачатак XI стст.), пачынаючы ад сыноў Святаслава, ужо амаль цалкам славянізаваны і прыцягнуты да сваіх княстваў. Іх улада ў землях трывала суадносіцца з насельніцтвам гэтых зямель і шмат у чым залежыць ад мясцовага паспольства. Гэтыя князі: Яраполк Святаславіч, Уладзімір Святаславіч, Ізяслаў Уладзіміравіч, Святаполк Яраполкавіч, Яраслаў Уладзіміравіч, – ужо не ажыцццяўляюць авантурных ваяўнічых выпраў на замежныя тэрыторыі з мэтай рабавання і захопу каштоўнасцей, як гэта рабілі першыя Рурыкавічы. Іх дзейнасць галоўным чынам накіравана на ўзмацненне і тэрытарыяльнае пашырэнне сваіх дзяржаў. Ваенныя мэты Уладзіміра Святаславіча, Яраслава Уладзіміравіча, Брачыслава Ізяславіча, Усяслава Брачыславіча маюць хутчэй стратэгічны характар і мала чым нагадваюць разбойніцкія набегі. Так, у канцы X ст. на землях Усходняй Еўропы княжацкая ўлада набывае шчыльную тэрытарыяльную прывязку. Вярхоўная ўлада стала замацоўвацца за пэўнай тэрыторыяй.

Пры гэтым важным фактарам узмацнення княжацкай улады і ролі князя ў грамадскім кіраванні з’яўляецца падтрымка князя шырокімі коламі грамадства. У дадзены перыяд (канец X – пачатак XI стст.) князі не маглі не арыентавацца ў сваіх дзеяннях на ажыцццяўленне патрэбаў і чаканняў падуладнага насельніцтва. Пры ажжыцяўленні ўладных функцый княжацкая ўлада карысталася аўтарытэтам не толькі сярод прадстаўнікоў палітычнай эліты, але і сярод шырокіх колаў свабоднага насельніцтва [9, с. 266]. На думку В.І. Сергеевіча, насельніцтва разумее сваю няздольнасць уладкавацца без княжацкай улады і разам з тым разумее неабходнасць даць яму высокае месца ў сваім асяроддзі, без чаго было б не магчыма дасягнуць мэт грамадскага міру і стабільнага развіцця краіны. Як адзначае даследчык: “Князь – ёсць народная ўлада” [10, с. 173]. Пры значнай ідэалізацыі ролі і месца князя, як прадстаўніка ўлады народа, якое мае месца ў працах В.І. Сергеевіча, варта прызнаць, што ў перыяд фарміраваня дзяржаў і канчатковага ўсталявання княжацкіх дынастый Рурыкавічаў і Рагвалодавічаў, для князёў была неабходна падтрымка грамадства, пры чым не толькі арыстакратыі, але і простага насельніцтва.

Прыкладам такой грамадскай падтрымцы з’яўляецца дапамога наўгародцаў князю Яраславу Уладзіміравічу ў яго барацьбе з Святаполкам у 1015–1019 гг. [11, с. 15]. Пра падтрымку мясцовым

насельніцтвам свайго княжацкага роду таксама сведчыць замацаванне асобнай дынастыі Рагвалодавічаў у Полацку (пачатак XI ст.) [12, с. 92–100]. Спакойнае княжэнне маладога князя Брачыслава Ізяславіча было абумоўлена той роляй, якую адыгрывала мясцовая знаць пры магчымай згодзе і падтрымцы шырокага кола грамадства Полацкай зямлі, бо, ўлічваючы малалетні ўзрост Брачыслава, прыкладна да пачатку 1020-х гг. рэальная ўлада ў Полацку належала баярскаму савету [13, с. 4]. Таксама можна меркаваць, што пад пэўным уплывам мясцовых колаў, прэтэнзіі на самастойнасць Тураўскай зямлі ад Кіева выказваў Святаполк [7, с. 12–13]. Менавіта падтрымка палітычнай эліты і шырокіх колаў насельніцтва дапамагала князям дабівацца сваіх мэт і браць верх у палітычнай барацьбе.

У славянскім свеце выключнасць правоў асобных дынастый на ажыццяўленне ўлады ў сваіх краінах дакладана вызначаецца з канца X ст. [2, с. 278]. Разам з тым завяршаецца працэс усталявання ўлады адзінага роду Рурыкавічаў на тэрыторыі ўсходнеславянскіх племянных саюзаў. Станаўленне ўлады аднаго роду адбывалася на працягу другой паловы IX–X стст., і было звязана з паступовым падпарадкаваннем племянных тэрыторый і забойствам мясцовых племянных правадыроў і прышлых князёў – скандынаваў (з летапісаў вядома пра забойства ў Кіеве Аскольда і Дзіра, драўлянскага князя Мала) [14]. Канчаткова гэты працэс быў завершаны Уладзімірам Святаславічам, які фактычна знішчыў род полацкага князя Рагвалода і, магчыма, тураўскага князя Тура [15, с. 71]. Адносна князя Туры мы можам так меркаваць, бо гэты князь узгадваецца ў летапісе пад 980 г., але ўжо ў 988 г. "Аповесць аб мінулых часах" (далей АМЧ – *Ю.К.*), паведамляючы пра адміністрацыйную рэформу Уладзіміра Святаславіча, узгадвае ў якасці тураўскага князя прыёмнага сына Уладзіміра Святаполка Яраполкавічам [14, с. 54–85].

У час стварэння першых старажытнарускіх летапісных твораў у другой палове XI – пачатку XII стст., якія асвячаюць працэс станаўлення ўласнай дзяржавы і вызначаюць тую нішу, якую займае ўсходнеславянская супольнасць у хрысціянскай цывілізацыйнай айкумене, асаблівая ўвага надаецца ўзнікненню кіруючай у час працы летапісца дынастыі.

Менавіта прадстаўнікам кіруючай дынастыі належыць усталяванне той грамадскай сістэмы, якая працягвае існаваць пры напісанні летапісу. Паколькі гэтай грамадскай сістэмай была сама дзяржава, яе ўтварэнне асэнсоўвалася, як паходжанне дынастыі, а яе гісторыя – як смена дынастаў таго ж роду [16, с. 110].

Пасля канчатковага замацавання дынастыі Рурыкавічаў на землях усходнеславянскіх, фіна-ўгорскіх і балцкіх плямёнаў у канцы X – пачатку XI стст., легітымізацыі і манапалізацыі ўлады дадзенага роду, старажытнарускія летапісы і літаратурныя творы ("Слова аб Законе і Ласцы", "Сказанне аб Барысе і Глебе", "Аповесць аб мінулых часах") апраўдваюць і ідэялагічна замацоўваюць права Рурыкавічаў на ўладу. У якасці паказальнага прыкладу варта адзначыць словы, укладзеныя летапісцам у вусны князя Алега пад час забойства Аскольда і Дзіра: "*И рече Олегъ Асколду и Дирови:* "***Вы неста князя, ни рода княжа, но азъ есьм роду княжа***" (Тут і далей, вылучана мной – *Ю.К.*). *И вънесоша Игоря и се снъ Рюриковъ. И оубиша Асколд и Дира.*" [14, с. 17]. Так, выключныя правы ўлады Рурыкавічаў на ўсходнеславянскія землі абгрунтоўваюцца і замацоўваюцца ў пісьмовых крыніцах. Пасля міжусобнай вайны за кіеўскі стол (1015–1019 гг.) паміж Святаполкам Яраполкавічам і Яраславам Уладзіміравічам і перамогі апошняга, у пісьмовых творах актыўна абгрунтоўваецца права ўлады Яраслава, як прамога спадчынніка Уладзіміра і сыноў – нашчадкаў Яраслава: Ізяслава, Святаслава і Усевалада [17; 18; 14].

Працэс канчатковага афармлення дзяржаўнасці на тэрыторыі Усходняй Еўропы быў актыўна звязаны з ростам і ўзвышэннем асобных гарадоў як палітычных, эканамічных, рэлігійных і культурных цэнтраў зямель. У працэсе афармлення дзяржаўнасці (канец X – пачатак XI стст.), умацнення горада, як месца канцэнтрацыі вярхоўнай улады, галоўным чынам спрыяла адзначаная вышэй пэўная тэрытарыяльная прывязка князёў да сваіх зямель, падтрымка ўлады мясцовым насельніцтвам. Менавіта з ростам гарадоў звязана далейшае развіццё ўлады, ускладненне яе функцый і рост княжацкага апарата кіравання.

У гістарычнай навуцы вылучаюць тры асноўныя напрамкі горадаўтварэння на тэрыторыі ўсходнеславянскіх зямель: гандлёва-рамесны; абшчынна-феадальны; феадальны (дзяржаўны) [19, с. 233]. Станаўленне гарадскіх форм жыцця не мела агульнай сацыяльна-эканамічнай схемы.

У першыя стагоддзі дзяржаватворчых працэсаў (IX – першая палова X стст.) утварэнне некаторых протагарадскіх паселішчаў было абумоўлена функцыянаваннем трансеўрапейскай гандлёва-эканамічнай сістэмы, а менавіта шляхам "з вараг у арабы" і "з вараг у грэкі". На гэты перыяд прыходзіцца актыўнае фарміраванне і развіццё буйных, адкрытых гандлёва-рамесных ваенізаваных паселішчаў: Рурыкава Гарадзішча, Цімерова, Гнёздава, Шэставіц. Гэтыя паселішчы характарызуюцца, як асяродкі ваяўнічых дружын пад кантролем княжацкай улады, і для пачатковага станаўлення дзяржаўнасці маюць ключавое значэнне, бо з'яўляюцца адным з галоўных сродкаў матэрыяльнага забеспячэння і падтрымання іна-этнічнай (скандынаўскай) улады першых Рурыкавічаў. Характэрнай рысай гэтых паселішчаў з'яўлялася тое, што іх функцыянаванне было звязана выключна з дзейнасцю водных гандлёвых шляхоў. Пасля буй-

нога росквіту гэтых паселішчаў у X ст. яны прыпынілі сваё існаванне ў пачатку XI ст. Як слушна адзначае В.М. Ляўко, спыненне існавання паселішчаў сведчыць аб тым, што "дадзены шлях утварэння гарадской структуры не меў перспектывы" [20, с. 251].

У сваю чаргу стабілізацыя дзяржаўных структур, усталяванне вызначаных меж новых тэрытарыяльных утварэнняў прывялі да парушэння агульнай сеткі і сродкаў камунікацыі паміж дадзенымі цэнтрамі. У гэтай сувязі паказальна, што побач з ранейшымі цэнтрамі трансеўрапейскага гандлю, у другой палове X – пачатку XI стст. вылучаюцца і ўзнікаюць новыя гарады, якія вызначаюць якасна новы ўзровень у развіцці вярхоўнай княжацкай улады і, як вынік, дзяржаўнасці на старажытнарускіх землях. Побач з гандлёвымі паселішчамі, з'яўляюцца паўнавартасныя гарады, як адміністрацыйна-тэрытарыяльныя цэнтры: Ноўгарад (замест Рурыкава Гарадзішча), Яраслаўль (замест Цімерова), Растоў (замест Сарскага гарадзішча), Смаленск (замест Гнёздава), Чарнігаў (замест Шаставіц) [21, с. 40–43; 22, с. 81–85; 23, с. 55–60; 24, с. 345–347].

Што датычыцца беларускіх зямель у IX – пачатку XI стст. адкрытыя гандлёва-рамесныя паселішчы існавалі на Друцкім волаку, дзе выяўлены шэраг курганных могільнікаў паміж вёскамі Дроздава і Скавышкі. Падобны комплекс VIII–XI стст. зафіксаваны на Арэхаўскім волаку з Дняпра ў Заходнюю Дзвіну праз Лучосу [20, с. 251]. Як адзначае В. М. Ляўко: "Характэрнай рысай усіх гэтых паселішчаў з'яўляецца тое, што пасля буйнога росквіту ў X ст., яны прыпынілі сваё існаванне ў пачатку XI ст." [20, с. 251]. На беларускіх землях у якасці буйнога адкрытага гандлёва-рамеснага паселішча варта вылучыць комплекс Мохаў (на поўнач ад вусця р. Сож), які А. А. Макушнікаў вызначае як "ваенізаванае шматфункцыянальнае паселішча" [25, с. 78]. Асаблівасцю дадзенага комплексу з'яўляецца тое, што ён працягваў існаваць у XI ст. пасля заняпаду буйных паселішчаў, якія кантралявалі шлях "з вараг у грэкі" (Рурыкава Гарадзішча, Гнёздава, Шаставіц). Функцыянальнае прызначэнне Мохаўскага комплексу ў канцы X – пачатку XI стст. служыла іншым патрэбам часу, звязаным з замацаваннем дзяржаўных меж Кіеўскай дзяржавы.

Так, гандлёва-рамесныя паселішчы IX–X стст. па меры ўзмацнення княжацкай улады, паступовага фарміравання цэнтральнага апарату кіравання, станаўлення дакладна рэгламентаванай падатнай сітэмы з'яўляюцца няздольнымі для здзяйснення новых грамадскіх і дзяржаўных функцый.

У гэтым сэнсе варта адзначыць тыпалагічнае падабенства ўрбанізацыйных працэсаў у кантэксце станаўлення дзяржаўнасці на землях Старажытнай Русі і Скандынавіі, бо кампаратывісцкі метад дае магчымасць высветліць не толькі агульныя асаблівасці, але і адрозненні, што дазваляе выявіць асаблівыя рысы і спецыфіку даследуемага рэгіёна [26, с. 156–157].

Гарады як эканамічныя, палітычныя і рэлігійныя цэнтры ў параўнанні з Заходняй і Цэнтральнай Еўропай пачынаюць з'яўляцца ў Паўночнай Еўропе даволі позна (XI–XII стст.). Іх з'яўленне супадае з фарміраваннем першых дзяржаў, афіцыйным прыняццем і распаўсюджваннем хрысціянства.

У канцы X – першай палове XI стст. у Скандынавіі, як і ў Старажытнай Русі, адбываюцца істотныя змены. Як і на Русі, на тэрыторыі Скандынавіі знікаюць, або прыходзяць у заняпад буйныя гандлёва-рамесныя цэнтры: Бірка, Хэдэбю, Рібэ, Старая Упсала. На іх месцы ўзнікаюць новыя: Роскільдэ (Рібэ), Шлезвіг (Хэдебю), Сігтуна (Бірка) [27, с. 97–98]. Таксама на працягу XI–XIII стст. узнікаюць новыя гарады: Скара, Лінчопінг, Телье, Кальмар у Швецыі, Выбарг, затым Капенгаген, Орхус і Ольбарг, Одэнсе, Лунд і Мальмё – у Даніі; Нідарос-Транхейм, Берген, Ставангер, Тенберг і Осла – у Нарвегіі [28]. Як адзначае вядомы даследчык сярэднявечных скандынаўскіх гарадоў А. А. Сванідзе: "да канца эпохі вікінгаў амаль усе раннія скандынаўскія гарады зніклі. На іх месцы, альбо непадалёк ад іх выраслі новыя, ужо ўласна сярэднявечныя гарады. Новыя скандынаўскія гарады з самага пачатку, функцыянавалі, як цэнтры адміністрацыі і фіска, і, такім чынам, з'яўляліся цэнтрамі каралеўскай улады, а таксама царкоўнай арганізацыі." [28].

Дадзеныя працэсы адбываюцца практычна аднатыпна са Старажытнай Руссю і звязаны ў Скандынавіі з заканчэннем эпохі вікінгаў. Скандынаўскія ўладары таксама як і нашчадкі Святаслава Ігаравіча ў Старажытнай Русі, накіроўваюць сваю дзейнасць не на знешнія напады з мэтай захопу здабычы і атрымання славы, а на ўнутраную дзейнасць у сваіх дзяржавах. Распаўсюджанне хрысціянства і паступовае фарміраванне новай карціны свету адлюстроўваюць ломку традыцыйных уяўленняў аб ролі вайны і дзейнасці ўладара. Войны звязаны ўжо не столькі з рабаўнічымі набегамі, колькі з актыўнай унутры- і знешнепалітычнай дзейнасцю скандынаўскіх каралёў. Падобныя працэсы ранняга сярэднявечча адлюстроўваюцца ў функцыях вярхоўнай улады, якія палягаюць у правасуддзі, абароне хрысціян ад язычнікаў і пакаранні злачынцаў [29, с. 274–275].

Пры разглядзе працэсаў функцыянавання гарадоў, як цэнтраў сацыяльна-эканамічнага і адміністрацыйнага жыцця, варта прааналізаваць і пераасэнсаваць традыцыйны эвалюцыйны падыход зараджэння, станаўлення і развіцця раннесярэднявечных гарадоў на землях Уходняй Еўропы. Згодна з эвалюцыйнай тэорыяй развіцця гарадоў на землях Усходняй Еўропы (VIII–XIII стст.), іх развіццё праходзіла шэраг паслядоўных этапаў, якія характарызуюцца сваёй пераемнасцю. Так, невялікія гарадзішчы

племянной эпохі ў савецкай археалагчнай навуцы доўгі час лічыліся “зародкамі” будучых буйных гарадскіх палітычных цэнтраў [30, с. 53; 31, с. 113]. Аднак археалагічныя даследаванні апошніх дзесяцігоддзяў, у прыватнасці археалагічныя матэрыялы, сведчуць аб даволі познім узнікненні такіх палітычных цэнтраў як Ноўгарад, Смаленск, Чарнігаў, Яраслаўль [32, с. 8; 33, с. 18;34;]. На думку польскага археолага П. Урбанчыка, узнікненню гарадоў, як сацыяльна-эканамічных і палітычных цэнтраў пэўных тэрыторый, спрыялі не столькі глубінныя заканамернасці іх эвалюцыйнага развіцця, сколькі мэтанакіраваныя ініцыятывы палітычных эліт [35, с. 110–115]. Пры гэтым адметнай асаблівасцю гіпотэзы П. Урбанчыка з’яўляецца тэза аб карэнным адрозненні гарадоў дзяржаўнай эпохі ад разнастайных гарадзішч і цантральных паселішчаў больш ранняга часу [35, с. 110]. Сярод беларускіх археолагаў дадзеную канцэпцыю падтрымлівае гродзенскі даследчык Г.М. Семянчук, які выкарыстоўвае падобныя высновы пры даследаванні гарадоў беларускіх зямель IX–XIII стст. [36, с. 10–23].

Аналізуючы развіцце, функцыянальнае прызначэнне і тапаграфічную структуру старажытнарускіх гарадоў і паселішчаў, з дадзенымі высновамі можна пагадзіцца часткова. Прымаючы пад увагу познія культурныя слаі, выяўленыя ў Ноўгарадзе, Смаленске, Чарнігаве, дадзеныя схемы не выклікаюць сумневаў, улічваючы што іх узнікненне ў другой палове X–XI стст. было выклікана кардынальнымі пераменамі ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці. Аднак з шэрагу ўсходнеславянскіх гарадоў варта прыгадаць Кіеў, які ўзнік як племянны цэнтр усходнеславянскіх палян (меркавана VI–VII стст.) [24, с. 312], і Полацк, племянны цэнтр крывічоў, існаванне якога абумоўлена каланізацыйнымі працэсамі канца VIII–X стст., што безумоўна звязана з актыўнымі дзеяннямі княжацкай улады [37, с. 47]. На тэрыторыі Полацка паселішча на р. Палата да пачатку XI ст. пераўтварылася ў найбуйнейшы горад Усходняй Еўропы [38, с. 67–68]. Узнікненню новых гарадоў спрыяла, з аднаго боку, актыўная дзейнасць князёў, з другога боку, з іх дзейнасцю звязана ўдасканальванне гарадской структуры тых цэнтраў, якія ўзніклі ў дадзяржаўную эпоху пры актыўным удзеле той жа княжацкай улады (VIII–IX стст.) і развіваліся на працягу шэрага стагоддзяў.

Па падліках гісторыкаў у XI ст. на тэрыторыі Старажытнай Русі ўзніклі 58 новых гарадоў [31, с. 35]. Згодна за летапісамі і археалагічнымі дадзенымі, у канцы X–XI ст. на беларускіх землях узгадваюцца новыя гарады: Ізяслаўль (канец X – пачатак), Друцк (1001), Бярэсце (1019), Віцебск (1021), Копысь (1060), Браслаў (каля 1065), Менск (1067), Орша (1067), Лагойск (1078), Лукомль (1078), Пінск (1097) [20, с. 255]. Да гэтага пераліку варта дадаць Тураў, які упершыню фіксуецца ў летапісах пад 980 г. [14, с. 54].

Акрамя ўзнікнення новых гарадоў на старажытнарускіх (у тым ліку і беларускіх) землях пашыраецца тэрыторыя гарадоў, заснаваных і працягваючых актыўна функцыянаваць і развівацца ў VIII–IX стст. Плошча старажытнарускіх гарадоў IX–X стст. у асноўным абмяжоўвалася невялікімі дзяцінцамі, як цэнтрам засяроджвання ўлады. У сваю чаргу XI ст. характарызуецца новай з’явай у гісторыі старажытнарускага горада – узнікненнем пасада [31, с. 44]. Па вызначэнні Б.А. Цімашчука, наяўнасць у гарадской структуры пасада, як паселішча гандлёва-рамеснага люду, з’яўляецца галоўнай прыкметай горада, якая адрознівае яго ад княжацкіх крэпасцей і феадальных замкаў [39, с. 106]. Пры гэтым трэба улічваць, што *пачатак* гісторыі станаўлення пасадаў у старажытнарускіх гарадах варта суадносіць з паселішчамі, ці вакольным горадам, які пачынаў фарміравацца і развівацца вакол княжацкай крэпасці (дзяцінца) з IX ст. [40, с. 42]. У гэты перыяд (IX–X стст.) толькі пачынаецца фарміраванне сярэднявечных гарадоў, але гэта яшчэ не сведчыць пра іх канчатковае станаўленне, як буйных сацыяльна-эканамічных цэнтраў. У сваю чаргу, з XI ст. пачынаецца станаўленне старажытнарускага горада ў сацыяльна-эканамічным значэнні, што непасрэдным чынам адлюстроўваецца на працэсах фарміравання дзяржаў і канчатковага афармлення вярхоўнай улады.

У тапаграфічнай структуры Полацка, які быў заснаваны як цэнтр і асяродак славянскай каланізацыі Падзвіння, у XI ст. адбываюцца змены, якія маюць падабенства з іншымі гарадамі Старажытнай Русі. На правым беразе р. Палаты ўздоўж Заходняй Дзвіны фарміруецца Запалоцкі пасад [41, с. 52–53]. З XI ст. адбываецца фарміраванне Вялікага пасада, які быў заснаваны на старажытным паселішчы IX–X стст. (вакольнага горада), межы якога ён значна пераўзышоў [40, с. 34]. У XI ст. у якасці галоўнага сакральнага цэнтра Полацка і ўсяго Полацкага княства ўладкоўваецца Верхні замак, на якім пражываў епіскап з прыбліжанымі асобамі, і дзе ўзводзяцца культавыя і свецкія пабудовы для адміністрацыйна-цэрыманіяльных патрэб. [40, с. 76–80]. Пры гэтым паказальна, што рэзідэнцыя полацкага князя ў IX–XIV стст. не выходзіла за межы старажытнага гарадзішча [42, с. 37–39]. У гэтым сэнсе полацкі дзяцінец на працягу ранняга сярэднявечча да ўваходжання Полацка ў склад ВКЛ (пачатак XIV ст.) надзейна суадносіцца з тэрыторяй гарадзішча, тады як тэрыторыя Верхняга замка выконвае іншыя функцыі, звязаныя з рэлігійнымі і ідэялагічнымі мэтамі полацкіх князёў. Так, з пачатку XI ст. полацкае гарадзішча выкарыстоўвалася як рэзідэнцыя полацкіх князёў, нашчадкаў Рагвалода. Паводле археалагічных дадзеных, на полацкім гарадзішчы разам з князем пражывала рамеснае насельніцтва, якое абслугоўвала патрэбы княжацкага двара [40, с. 33]. Дадзеная з’ява з’яўляецца тыповай для старажытнарускіх гарадоў, калі на дзяцінцы размяшчаліся ювелірныя і рамесныя майстэрні, і пражывала вялікая колькасць насельніцтва [43, с. 33].

У XI ст. актыўна ўмацоўваюцца гарадскія дзяцінцы як цэнтры засяроджвання княжацкай улады, дзе ў выпадку небяспекі хавалася насельніцтва. Паводле археалагічных даследаванняў Д. У. Дука, "княжацкая рэзідэнцыя была надзейна ўмацавана, і менавіта яна выконвала функцыю абароны пасадскага люду ў часы ваеннай небяспекі" [40, с. 40]. Акрамя Полацка дзяцінцы ўсіх буйнейшых гарадоў Тураўскай зямлі XI ст. (Турава, Берасця, Давыд-Гарадка, Пінска) мелі ўнутрывальныя канструкцыі, равы і сістэму крапасной забудовы [44, с. 90–94]. Улічваючы, што асноўная функцыя княжацкай улады і прызначэння князя, як вярхоўнага кіраўніка грамадства, заключалася ў абароне насельніцтва, функцыя княжацкай рэзідэнцыі як крэпасці-сховішча пад час варожага нападу мела сімвалічнае значэнне.

Такім чынам, XI ст. на тэрыторыі Усходняй Еўропы можна ахарактарызаваць, як час гарадоў. Тэрытарыяльны рост гарадоў, удасканальванне тапаграфічнай гарадской структуры, узнікненне новых гарадоў, як рэгіянальных цэнтраў княжацкай улады, можна вылучыць як адзін з фактараў канчатковага фарміравання дзяржаўнасці на землях Усходняй Еўропы. Менавіта з гарадамі звязана далейшае развіццё княжацкай улады і ўдасканаленне яе функцый.

З ростам старых племянных цэнтраў і ўзнікненнем новых гарадоў цесна звязаны рост княжацкага апарату кіравання, які таксама з'яўляецца адным з асноўных фактараў фарміравання дзяржаўнасці. Спачатку прымітыўныя функцыі апарату кіравання выконваў сам князь і яго варажская дружына (IX–X стст.).

У канцы X ст. Уладзімір Святаславіч пасля ўзяцця Кіева вылучыў лепшых мужоў і адаслаў іх кіраваць сваімі гарадамі [14, с. 83]. Пры гэтым выкарыстанне варажскага кантынгенту ў якасці наёмных атрадаў, а не асноўнай часткі войска, Уладзімірам Святаславічам паказальна, бо дадзены факт сведчыць аб канчатковай славянізацыі Рурыкавічаў, пэўным адасабленні і аддаленні іх ад "скандынаўскіх каранёў", іх уваходжанні ў мясцовае грамадства. З канца X ст. варагаў выкарыстоўваюць у якасці наёмнага войска, пасля чаго адпраўляюць на перыфірыю ў пабудаваныя гарады, якія выконваюць ролю стратэгічных фарпостаў новых дзяржаў – Кіеўскага княства і Полацкай зямлі.

Развіццё дзяржаўнага кіравання і горадабудаўніцтва падоўжыла традыцыю прыцягнення да ўлады вайскова-дружыннае саслоўе. З канца X ст. на старажытнарускіх землях адбываецца фарміраванне дзяржаўнага княжацкага апарату, які, верагодна, выходзіць з дружыннай арганізацыі. Яго далучэнне да ўлады, тэрытарыяльнай арганізацыі і закону завяршыла фарміраванне асноўных, базавых элементаў на якіх грунтавалася дзяржава.

З дапамогай княжацкага апарату кіравання, які складаўся з дружыннага саслоўя і быў накіраваны ў новыя гарады, набывала выразныя абрысы тэрытарыяльная інфраструктура дзяржаў Рурыкавічаў і Рагвалодавічаў. Менавіта ўмацаваныя памежныя фарпосты сталі асновай дадзенай інфраструктуры, будаўніцтва якіх адбывалася па ініцыятыве княжацкай улады, і часцяком новыя гарады атрымлівалі назву ў гонар князя-заснавальніка, чым падкрэслівалася іх справа ў засваенні новых тэрыторый і арганізацыі абароны краіны.

У АМЧ паведамляецца пра паспяховыя ваенныя выправы Уладзіміра супраць Польшчы ў 981 г. (у выніку чаго былі далучаны памежныя стратэгічныя пункты Перамышль і Чэрвень) супраць вяцічаў у 982 г., супраць яцвягаў у 983 г., супраць радзімічаў у 984 г. [14, с. 58–60].

У выніку дадзеных паходаў (982 і 984 гг.) былі канчаткова далучаны да Кіеўскай дзяржавы племянныя тэрыторыі вяцічаў і радзімічаў. Прыблізна ў гэты час ранейшае ўмацаванае паселішча, размешчанае на беларускіх землях – Мохаў, якое існавала на землях радзімічаў з канца IX ст. і першапачаткова выконвала ролю фарпоста на дняпроўскім адрэзку "вялікага палюддзя" – у апошняй чвэрці X ст. пры Уладзіміры стала выконваць функцыю замацавання ўлады кіеўскіх князёў.

Галоўная прычына функцыянавання Мохаўскага пасялення ў канцы X ст. – канчатковае падпарадкаванне зямель радзімічаў, якое і адбылося ў выніку паспяховага паходу ваяводы Волчага Хваста ў 984 г. Паводле археалагічных даследаванняў А.А. Макушнікава, матэрыялы Мохава сведчаць аб прысутнасці ў ім воінаў-крывічоў і іншых вынаходнікаў з паўночных абласцей Русі. На думку даследчыка, менавіта прышлыя ваенныя кантынгенты не звязаныя з мясцовым этнічным асяроддзем (асабліва з дрыгавіцкай і радзіміцкай арыстакратыяй) і ў сілу абставінаў інкарпарыраваныя ў яе, выступалі адным з інструментаў падпарадкавання Кіеву абарыгеннага насельніцтва [25, с. 88]. Варта адзначыць, што воіны паўночных абласцей Русі (скандынавы, славяне, балты, фіна-ўгры) сталі асновай для засваення і падпарадкавання суседніх тэрыторый у Бранскім Падзясненні [25, с. 16–22].

Умацаванне Мохаўскага пасялення ў апошняй трэці X ст. можна звязваць з замацаваннем абароназдольнасці паўднёвых межаў Кіеўскай дзяржавы ад печанегаў і іншых стэпавых народаў. Як адзначае А.А. Макушнікаў, "ва ўмовах печанежскай пагрозы для Русі патрабавалася пастаяннае падтрыманне абароназдольнасці нават на ўдаленых ад паўднёвага рубяжа градаў і ваенных лагероў. Да ліку апошніх можна аднесці і Мохаўскае паселішча, якое "запірала" Гомельскае Падняпроўе з поўдня" [25, с. 89].

У гэтым выпадку паказальна грандыёзныя будаўнічыя мерапрыемствы Уладзіміра Святаславіча ў канцы X ст. на паўднёварускіх межах, і ўтварэнне ім агульнарускай паўднёвай абарончай лініі. У сітуацыі печанежскага націску канца X ст. Уладзімір Святаславіч у 988 г. перасяліў у зону будаўніцтва новых

пасяленняў прадстаўнікоў крывічоў, славен, вяцічаў, чудзі. Як паведамляе АМЧ: “*И нача* (Уладзімір – *Ю.К.*) *ставити городы по Десне, и по Востри, и по Трубежеви, и по Стуле, и по Стугне. И поча нарубати муже лучшие от словен и от кривичь, и от чуди, и от вятичь, и от них насели грады; бе бо рать от печенег*” [14, с. 83].

Паказальна, што менавіта Уладзімір Святаславіч пачаў называць межавыя паўднёварускія гарады сваім імем. Так, адміністрацыйна-палітычным цэнтрам Валыні ён зрабіў пабудаваны ім горад Уладзімір. На тэрыторыі сучаснай Галіцыі ён пабудаваў горад Васільеў, названы так у гонар хрысціянскага імя кіеўскага князя. Горад-крэпасць з такім жа імем быў пабудаваны на пагранічнай з печанежскай тэрыторыяй р. Стугне. Так, новыя ўмацаваныя гарады, у асноўным пабудаваныя на перыфірыі старажытнарускіх зямель, названыя язычніцкімі і хрысціянскімі імёнамі Уладзіміра Святаславіча, маркіравалі яго ўладанні на паўднёвым захадзе і поўдні Кіеўскай дзяржавы, дзе ваенна-палітычная сітуацыя ў час яго княжэння стабілізавалася і можна было больш-меньш дакладна вызначыць дзяржаўныя межы [45, с. 306].

Падобныя мерапрыемствы па канчатковаму падпарадкаванню і інкарпарацыі аддаленых ад Кіева тэрыторый ажыццяўляліся пры сыне Уладзіміра Яраславе (першая палова XI ст.). Так, канчатковая экспансія на паўночна-ўсходнія межы фіна-ўгорскіх тэрыторый, з’явілася вынікам утварэння Яраслаўля (у перыяд Растоўскага княжэння Яраслава з 988 па 1010 г.) [46, с. 63]. У землях чудзі Яраславам быў заснаваны горад Юр’еў (1030 г.) [14, с. 105].

Пабудова новых гарадоў на перыферыі княстваў, з аднаго боку, з’уляецца праявай каланізацыйных працэсаў, якія ў параўнанні з племянным перыядам адбываюцца на якасна новым, дзяржаўным узроўні, з другога боку, як вызначэнне базавых фарпостаў, якія маркіруюць межы дзяржавы, добра бачна на прыкладзе дзейнасці полацкіх князёў канца X – пачатку XII стст. У дадзеных працэсах полацкія князі відавочна выступалі паўнавартаснымі сюзерэнамі дзяржаўнага ўтварэння (Полацкай зямлі), і ў аснове каланізацыйных працэсаў было эканамічнае развіццё рэгіёна, якое вяло да росту насельніцтва і, як вынік, засваення новых тэрыторый. Як адзначае Я.У. Новікаў: “У адрозненні ад непрадказальных палітычных зменаў эпохі перасялення народаў, ціск эканамічных патрэбаў рабіў плынь каланізацыі (XI ст. – *Ю.К.*) больш пастаяннай і магутнай” [7, с. 27].

Адным з самых старажытных полацкіх гарадоў быў Заслаўе – першапачаткова неўмацаванае паселішча, заснаванае на мяжы з Літвой у сярэдзіне X ст. Недалёка ад яго ў канцы X ст. узнік горад-крэпасць Ізяслаўль, пабудаваны Уладзімірам у гонар полацкага князя Ізяслава Уладзіміравіча [14, с. 78]. Пасля адасаблення Полацкай зямлі ад Кіева (пачатак XI ст.) Заслаўе перайшоў ў спадчыну полацкім князям і зноў пачаў адыгрываць ролю памежнага ўмацаванага фарпосту на мяжы з балтамі [47, с. 106–110].

У час кіравання Полацкай зямлёй Брачыслава Ізяславіча (1003–1044 гг.) адбываецца актыўная каланізацыя балцкіх зямель у паўднёвым і паўночна-заходнім накірунку. У першай палове XI ст. палачане пераймаюць у Кіева ўладу над Менскам і будуюць Лагжаск (Лагойск) [48, с. 218]. У гады княжэння Брачыслава на крайнім захадзе полацкіх уладанняў, на тэрыторыі балцкай зямлі Нальшаны, на месцы спаленага ў сярэдзіне XI ст. балцкага паселішча быў пабудаваны Браслаў [48, с. 218–220]. Назва новага ўмацаванага пункту празрыста суадносіцца з імем полацкага князя Брачыслава. Па звестках В.М. Тацішчава, у 1102 г. Барыс Усяславіч, які заняў полацкі пасад пасля смерці Усяслава Брачыславіча, перамог яцвягаў і пабудаваў горад Барысаў, назваўшы яго сваім імем, які магчыма быў такасма заселены палоннымі яцвягамі [49, с. 123].

Паводле ўскосных археалагічных матэрыялаў можна меркаваць, што ў XI ст. недалёка ад Браслава ўзнікла пасяленне Маскавічы, дзе былі выяўлены сцены з тоўстых гарызантальна пакладзеных бярвён XI–XII стст. [50, с. 62]. У сувязі з тым, што паселішча ў XI–XIII стст. выконвала ролю парубежнага пункту на мяжы з балцкай тэрыторыяй, яго насельніцтва ўяўляла этнічны кангламерат. Сярод знаходак, якія суадносяцца з усходнеславянскім, фіна-ўгорскім, прыбалтыйскім насельніцтвам, асбліва вылучаецца скандынаўскі этнічны кампанент. Аб прысутнасці ў Маскавічах скандынаваў сведчаць раўнаплечная фібула, падвеска-ланцугатрымальнік, падвеска ў выглядзе вадаплаваючай птушкі, а таксама косткі жывёл з нанесенымі на іх рунічнымі надпісамі [51, с. 16]. Скандынаўскія знаходкі, якія датуюцца XII ст., у прыватнасці косткі з выявамі рун, якія шмат у чым адрозніваюцца ад класічнага скандынаўскага рунічнага пісьма, сведчаць аб тым, што руны былі нанесены нашчадкамі скандынаваў, якія нарадзіліся на Полацкай зямлі [52, с. 47]. На аснове дадзеных вынікаў можна зрабіць выснову аб пражыванні на тэрыторыі Маскавіч XII–XIII стст. нашчадкаў скандынаваў, якія засялілі дадзеную крэпасць раней.

Калі ўлічваць, што паселішча было заснавана ў XI ст., і значная яго частка складалася з прадстаўнікоў розных этнічных груп (сярод якіх вылучаюцца скандынаўскія ваяры), можна меркаваць, што адзін з полацкіх князёў XI ст. (Брачыслаў або Усяслаў) ажыццяўляў дзеянні, падобныя на тыя, якія былі праведзены ў 980 г. Уладзімірам Святаславічам. Нарманы, якія спачатку выкарыстоўваліся ў якасці наёмнага войска, пасля дасягнення палітычных мэт Уладзіміра былі накіраваны ў асобныя гарады (хутчэй за ўсё на перыфірыю): “*и избра* (Уладзімір – *Ю.К.*) *от нихъ* (вараг – *Ю.К.*) *мужи добры и смыслены,*

*и раздая имъ грады…* ” [14, с. 56]. У канцы X ст. Уладзімірам былі заснаваны парубежныя ўмацаваныя пункты, заселеныя прадстаўнікамі розных этнічных груп (славенамі, вяцічамі, крывічамі, чуддзю і г.д.). Згодна з летапісам, у невядомыя гарады, у якасці захавання бяспекі ў Кіеве, былі накіраваны ваяўнічыя варагі.

Падобныя дзеянні маглі ажжыцяўляцца таксама і Брачыславам Ізяславічам, які пасля заснавання Браслава працягваў каланізацыю балцкіх тэрыторый, рухаючыся на поўнач (што і стала вынікам заснавання ўмацаванага паселішча каля Маскавіч). Пра тое, што Брачыслаў карыстаўся падтрымкай скандынаўскіх наймітаў сведчыць ісландская сага “Пасма аб Эймундзе” [53].

Канчатковаму афармленню дзяржаўных арганізацый на землях Усходняй Еўропы спрыяла прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства. На землях Старажытнай Русі хрыціянства ў якасці афіцыйнай рэлігіі было прынята Уладзімірам Святаславічам напрыканцы X ст. (па АМЧ 988 г.) [14, с. 67]. З канца X ст. распаўсюджванне хрысціянства на падуладных тэрыторыях ажжыцяўляецца пры актыўнай падтрымцы і з удзелам княжацкай улады (найбольш актыўна з пачатку XI ст.).

У адрозненені ад ранейшых спроб цэнтралізацыі стракатых усходнеславянскіх, балцкіх, фіна-ўгорскіх племянных тэрыторый у адзіны дзяржаўны арганізм з дапамогай усталявання ў Кіеве агульнага язычніцкага пантэону (980 г.), хрысціянская монатэістычная рэлігія стварае якасна новы падмурак для канчатковага дзяржаваўтварэння, легітымізацыі і сакралізацыі вярхоўнай улады. У адрозненні ад політэістычнага язычніцтва хрысціянская вера ў адзінага Бога адпавядала адзінаўладдзю князя ў дзяржаве, г.зн. духоўна асвячала гэтую ўладу. У сваю чаргу хрысціянскае духавенства, якое замяніла сабой ранейшы інстытут жрэчаства, падтрымлівала княжацкую ўладу і было яе апорай. Варта прыгадаць пасланне апостала Паўла да рымлян, дзе фактычна абвяшчаецца багаабранасць княжацкай улады: “*Усякая душа няхай скараецца вышэйшым уладам, бо няма ўлады не ад Бога; а ўлады, ад Бога ўстаноўлены. Таму той, хто супрацівіцца ўладзе, супрацівіцца Божаму усталяванню*” (Рым., гл. 13:1). Дадзеныя ідэі актыўна былі прыняты разам з хрысціянскай рэлігіяй на Русі і актыўна распаўсюджваліся старажытнарускай інтэлектуальнай элітай – святарамі і манахамі.

Выбар Уладзіміра Святаславіча ўсходне-хрысціянскага вучэння з Візантыі ў супрацьвагу лацінскаму вучэнню Рыма абумоўлены не толькі шматлікімі ваеннымі, гандлёвымі і дымламатычнымі стасункамі Русі і Канстанцінопаля IX–X стст. [54, с. 141]. Нам бачыцца, што адна з галоўных прычын выбару ўсходняга хрысціянства была абумоўлена характарам свецкай (княжацкай) улады і той роллю, якую адыгрывала ў дзяржаўных справах духавенства.

У адрозненні ад каталіцтва, праваслаўная царква стварала магчымасці для ажыццяўлення вярхоўнай свецкай улады без альтэрнатыўных імкненняў да ўлады духавенства. Як адзначаў дарэвалюцыйны гісторык царквы Я.Е. Галубінскі: “Улада грамадзянская вымушана матэрыяльна падтрымліваць і знешнім чынам ахоўваць уладу царкоўную. З іншага боку, гэтая апошняя павінна ўяўляць сабой маральны пачатак, які б маральным чынам дабратворна ўплываў на грамадскую ўладу” [55, с. 547]. У гэтым сэнсе свецкая ўлада з’яўлялася вызначальнай, г.зн. князі ў парушэнне кананічных правіл па сваёй волі абіралі епіскапаў, маглі пазбавіць пасады епіскапа насуперак царкоўнаму суду і г.д. [55, с. 552–554].

У якасці матэрыяльнай падтрымкі князь вылучаў са сваіх даходаў дзесятую частку на ўтрыманне царкоўнай арганізацыі [14, с. 69]. Пры гэтым паказальна, што т.зв. дзесяціна шырока выкарыстоўвалася ў Заходняй Еўропе [56, с. 178]. У Візантыі дадзеная традыцыя не атрымала распаўсюджванне. Такім чынам, паводле дзеянняў Уладзіміра царква павінна была стаць першым саюзнікам княжацкай ўлады, якая залежала ад яго матэрыяльна і палітычна. Прымаючы і распаўсюджваючы праваслаўе, Уладзімір Святаславіч надае царкве ідэялагічны падмурак, які б дазваляў яму аб’яднаць разрозненыя племянныя ўтварэнні ў Кіеўскую дзяржаву пад главенствам аднаго Бога і аднаго ўладара, як яго прамога намесніка [45, с. 281].

Выбар візантыйскага хрысціянскага ўзору паўплываў таксама на перанясенне пэўных візантыйскіх ідэйна-палітычных канструкцый на старажытнарускую глебу. Ужо сама падзея жаніцьбы Уладзіміра на візантыйскай прынцэсе Анне, сястры імператараў Васілія II і Канстанціна VIII, у вачах летапісца, а магчыма і самаго Уладзіміра, надавала кіеўскаму князю статус датычнасці і роўнасці з хрысціянскімі імператарамі.

Паказальна ў гэтым сэнсе летапісная легенда аб паходзе, які здзейсніў Уладзімір на візантыйскую правінцыю Херсанес (Карсунь). Для візантыйскіх імператараў роднасць з кіраўніком “варварскага народу” была зневажальнай. Пра магчымасць падобных выпадкаў сваіх нашчадкаў папярэджваў Канстанцін VII Парфірародны: “*Калі народ які-небудзь з гэтых няслушных і бязбожных паўночных плямёнаў папросіць аб сваяцтве праз шлюб з васілеўсам рамеяў, г.зн. альбо дачку яго атрымаць у жонкі, альбо выдаць сваю дачку, васілеўсу ў жонкі або сыну васілеўса, павінна табе адхіліць і гэтае іх неразумнае патрабаванне...*” [57, с. 59].

Паходам на Херсанес Уладзімір вымусіў візантыйскіх імператараў выдаць за яго Анну. Атрымаўшы яе ў якасці жонкі, Уладзімір пэўным чынам прынізіў імператараў-супраціўцаляў: ён перадаў ім у якасці вясельнага вена гэты захоплены горад, які належаў імператарам па праву [45, с. 278]. Корсуньская

легенда аб узяцці Херсанеса магла быць выкарыстана ў якасці адной з першых спроб ідэялагічнага абгрунтавання роўнасці і пераемнасці ўлады кіеўскіх князёў у візантыйскіх імператараў, што знайшло сваё адлюстраванне ў ідэялагічнай канструкцыі "Кіеў – другі Канстанцінопаль", або "Кіеў – другі Іерусалім" [58, с. 355–366].

Пасля прыняцця хрысціянства Старажытная Русь уваходзіць у агульнаеўрапейскую цывілізацыйную прастору. У адрозненні ад ранейшых часоў яна гэта робіць не з дапамогай кантроля над функцыянаваннем гандлёвых артэрый альбо ваенных паходаў. Адзін з галоўных фактараў наладжвання міждзяржаўных кантактаў, палітычных і гандлёвых саюзаў – міждынастычныя шлюбы. Вельмі важна, што для дзяржаў Усходняй Еўропы дадзеныя шлюбы магчымы толькі пасля прыняцця хрысціянства ў якасці афіцыйнай рэлігіі, на што таксама звяртаў увагу Канстанцін Парфірародны: "*ніколі васілеўс рамееў не павінен парадніцца праз шлюб з народам, які прытрымліваецца чужых звычаяў, у параўнанні з рамейскім устанаўленнем,* ***асабліва з іншаверным і неахрышчаным****, хіба што з адными франкамі*" [57, с. 61]. Міждзяржаўныя шлюбы ў дадзеным выпадку давалі магчымасць князям заключаць саюзы і дамовы з уладарамі іншых хрысціянскіх краін. Русь дамангольскага часу, дзякуючы гэтым дынастычным сувязям, уступіла ў агульнаеўрапейскую хрысціянскую цывілізацыйна-культурную супольнасць як паўнавартасная дзяржава.

З прыняццем хрысціянства ў старажытнарускіх князёў з'яўляюцца новыя магчымасці для рэпрэзінтацыі ўласнай улады. Чаканка манет з'яўляецца адной з форм пазіцыянавання ўзроўня вялікакняжацкай улады з некаторай апорай на візантыйскія хрысціянскія ўзоры. Аналізуючы ідэялагічную пераемнасць ўлады кіеўскага князя Уладзіміра ад візантыйскіх імператараў, варта адзначыць, што на першым этапе пасля прыняцця хрысціянства златнікі і сярэбранікі Уладзіміра капіруюць соліды візантыйскіх імператараў Васілія II і Канстанціна VIII (976–1025). Таксама ўзорам для пераймання маглі служыць візантыйскія імператарскія пячаткі X ст. [24, с. 413].

Чаканка манет па ініцыятыве Уладзіміра Святаславіча (канец X ст. – 1015), Святаполка Яраполчыча (1015–1016; 1018–1019) і Яраслава Уладзіміравіча (1019–1054 гг.) працягвалася не больш за 30 гадоў, а выпускі манет былі нязначныя. Але найважнейшым у чаканцы манет кіеўскіх князёў было не эканамічнае, а ідэялагічнае значэнне. Сам факт чаканкі першых старажытнарускіх залатых і сярэбраных манет адлюстраваў два асноўных этапа ў гісторыі Усходняй Еўропы: утварэнне Старажытнарускай дзяржавы з цэнтрам у Кіеве, і прыняцце хрысціянскай рэлігіі ў якасці дзяржаўнай [24, с. 403]. Чаканка манет па ініцыятыве княжацкай улады, як адзін з галоўных фактараў рэпрэзінтацыі і легітымізацыі ўлады, быў магчымы толькі пасля прыняцця хрысціянства і канчатковага афармлення дзяржаўнасці.

У кантэксце гісторыка-параўнальнага аналізу дзяржаватворчых працэсаў на тэрыторыі Скандынавіі і Старажытнай Русі варта адзначыць, што ў скандынаўскім, як і ў старажытнарускім грамадстве, на мяжы X–XI стст. адной з асноўных прыкмет і сродкаў умацавання ўлады, а таксама аўтарытэта адзінага ўладара, было выкарыстанне манетнай чаканкі. Сярод першых каралей трох скандынаўскіх дзяржаў, якія чаканілі ўласную манету, былі хрысціцелі сваіх дзяржаў: Олаф Тругвасан, Харальд Сінізубы і Олаф Шведскі [59, с. 548].

У гістарычнай навуцы выказваюцца думкі аб адным з першых пранікненняў хрысціянскага вучэння на Полаччыну ў канцы X ст. праз скандынаўскага месіянера Торвальда Кондрансана, аб чым паведамляецца ў ісландскай "Сазе аб хрышчэнні". У творы паведамляецца, што Торвальд памёр на Русі недалёка ад Полацка (Палтэск'і) і пахаваны ў адной гары ў царкве Іаана Хрысціцеля, і жыхары Полацка называюць яго святым [60]. Пытанне пра распаўсюджванне хрысціянства на Полацкай зямлі Торвальдам застаецца да канца не вырашаным, паколькі не знойдзена яго пахаванне. Але магчыма меркаваць пра месіянерскую дзейнасць Торвальда і пабудову ім аднаго з першых хрысціянскіх храмаў, дзе ён і быў пахаваны. Але пры гэтым дакладна вядома, што найбольш актыўнае распаўсюджванне хрысціянства і хрысціянізацыя насельніцтва былі звязаны з вярхоўнай княжацкай уладай.

Паводле АМЧ на беларускія землі хрысціянства прыйшло з Кіева. Актыўнае распаўсюджванне новай веры большасць беларускіх гісторыкаў звязвае з княжэннем у Полацку Ізяслава Уладзіміравіча (канец X – 1001). Дадзеная князю характарыстыка ў Ніканаўскім летапісе гаворыць аб Ізяславе як добрасумленным хрысціяніне [61, с. 68]. Паводле паведамленняў Цвярскога летапісу, старэйшым полацкім храмам была царква св. Багародзіцы, якая ўзгадваецца пад 1001 г., а ў АМЧ пад 1007 г. у сувязі з пераносам рэшткаў полацкіх князёў Ізяслава і яго сына Усяслава [62, с. 118]. Можна гепатэтычна меркаваць, што дадзеная царква была пабудавана яшчэ пры жыцці Ізяслава, і, такім чынам, была старэйшым хрысціянскім храмам у Полацку [63, с. 39]. Пры гэтым варта адзначыць, што першай кіеўскай мураванай царквой, пабудаванай у першыя гады пасля прыняцця хрысціянства, таксама стала царква св. Багародзіцы. Яна была закладзена ў 989–991 гг. і асвечана ўжо ў 992 г. [64, с. 7]. Магчыма полацкі князь Ізяслаў, з'яўляючыся фактычна намеснікам князя Уладзіміра (пасля 988 г.) і праваднікам яго палітыкі, абапіраецца на ўзоры, якія выкарыстоўвае яго бацька, кіеўскі князь Уладзімір.

Як адзначае М.Б. Свярдлоў, кіеўская царква св. Багародзіцы была пабудавана па ўзору царквы св. Апосталаў (усыпальніцы Канстанціна Вялікага) і царквы св. Багародзіцы ў Вялікім палацы Канстанцінопаля [45, с. 287]. Канстанцінопальская царква была пабудавана Васіліем Макіданяніным, заснавацелем дынастыі, да якой належала жонка Уладзіміра Анна і яе браты імператары Васілій II і Канстанцін VIII. Такім чынам, кіеўская царква св. Багародзіцы, пабудаваная Уладзімірам Святаславічам, як і жаніцьба князя на візантыйскай прынцэсе, злучала Уладзіміра з дынастычнай і царкоўнай традыцыяй Візантыі. У сваю чаргу пабудова ў Полацку Ізяславам Уладзіміравічам царквы св. Багародзіцы пэўным чынам пераймала кіеўскі ўзор, а праз яго Полацк далучаўся і да візантыйскай царкоўна-культурнай і цывілізацыйнай спадчыны.

Пасля прыняцця хрысціянства кіеўскі вялікі князь Уладзімір Святаславіч уводзіць новую сістэму кіравання Старажытнарускай дзяржавай. Уладзімір пасадзіў сваіх сыноў намеснікамі ў Ноўгарадзе, Полацку, Тураве, Растове, Мураме, Драўлянскай зямле, Уладзіміры, Тмутаракані [14]. Княжэнні займалі сыны вялікага князя ў парадку старэйшынства. Па значнасці другім пасля Кіева княжэннем было Наўгародскае. Яго займаў старэйшы з братоў. Калі старэйшы з братоў паміраў, яго месца займаў наступны па старэйшынству князь. Іншыя персоўваліся па іерархічнай лесвіцы на адну прыступку ўгору. Рэформа Уладзіміра надала пэўную трываласць і цэнтаралізаванасць сістэме дзяржаўнага кіравання, і паклала канец існаванню племянных княжэнняў [65, с. 505].

Трэба адзначыць, што галоўны сэнс рэформы палягаў у замене племянных князёў сынамі Уладзіміра ў падуладных гарадах і, такім чынам, замены мясцовай улады прадстаўнікамі роду Рурыкавічаў. У Полацку Уладзімір пасадзіў аднаго са сваіх старэйшых сыноў Ізяслава. Знакаміты беларускі археолаг Э.М. Загарульскі мае рацыю калі сцвярджае, што наданне Полацка Ізяславу Уладзіміравічу было абумоўлена некалькімі абставінамі. Па-першае, тым стратэгічным значэннем, якое мела Полаччына: праз Полацкую зямлю па Дзвіне праходзіў адзін з галоўных гандлёвых шляхоў "з вараг у грэкі". Па-другое, полацкім княствам калісьці кіраваў дзед Ізяслава Рагвалод. Дадзеныя абставіны пазней ператварыліся ў звычай – накіроўваць князёў у тыя вобласці, якія раней кіраваліся бацькамі гэтых князёў, і з цягам часу набылі статус " радавых вотчын" пэўнай княжацкай лініі [66, с. 92]. Варта таксама дадаць, што ў пасаджэнні Ізяслава Уладзіміравіча ў Полацку значную ролю адыграла мясцовая арыстакратыя (баярства), якое было зацікаўлена, каб княжацкую лінію працягваў спадчыннік Рагвалода. Праўленне Ізяслава (канец X – 1001) характарызуецца яго падпарадкаваннем кіеўскаму князю Уладзіміру, і звязваць з гэтым князем адраджэнне полацкай дзяржаўнасці на наш погляд немагчыма.

Пры наданні княжацкіх сталоў сынам Уладзіміра паказальным з'яўляецца размеркаванне гарадоў паводле іх старэйшынства. Старэйшы сын Вышаслаў быў накіраваны ў Ноўгарад, Ізяслаў – у Полацк, Святаполк – у Тураў, Яраслаў – у Растоў. Пасля смерці Вышаслава Уладзімір перамясціў у Ноўгарад Яраслава, Барыс атрымаў Растоў, Глеб – Мурам, а Святаслаў быў пасаджаны ў "Драўлянскай зямлі" [14, с. 85].

Зыходзячы з таго, у якім парадку сыны вялікага князя займалі свае сталы, можна меркаваць аб значнасці тых ці іншых княжэнняў [66, с. 91]. Паводле паведамлення Полацк займаў другое месца, а Тураў трэцяе. Значнасць Турава як горада, які праз водную сістэму Прыпяці злучаў Кіеўскую дзяржаву з краінамі Цантральнай і Заходняй Еўропы, і даволі вялікі ўплыў мясцовай арыстакратыі, увасобілася ў спробах сепаратызму і аддзялення гэтага рэгіёна ўжо пры Святаполку. Аб значнай апазіцыйнасці мясцовай палітычнай эліты можа ўскосна сведчыць паданне аб гвалтоўным распаўсюджанні ў гэтым горадзе хрысціянства [67, с. 480], што гаворыць аб непрыняцці мясцовым насельніцтвам палітыкі Уладзіміра. Гвалтоўнае насаджэнне хрысціянства, падаўленне сепаратыскіх памкненняў Святаполка, прадвызначыла кантроль з боку кіеўскіх князей, і больш чым на паўтары стагоддзі абумовіла поўную падпарадкаванасць гэтага рэгіёна Кіеву.

**Заключэнне.** Канец X – пачатак XI ст. характырызуецца новым крокам у эвалюцыі вярхоўнай ўлады. У параўнанні з ранейшым перыядам, IX – першай паловы X стст., адбываецца канчатковае замацаванне князёў за сваімі падуладнымі тэрыторыямі. У межах Старажытнай Русі манапольнае права на ўладу канчаткова захоўваецца за прадстаўнікамі роду Рурыкавічаў. Канец X – пачатак XI ст. характарызуецца станаўленнем полацкай княжацкай дынастыі і набыццём самастойнасці Полацкай зямлі.

Пра канчатковае фарміраванне дзяржаўных утварэнняў на землях Усходняй Еўропы сведчыць пабудова новых гарадоў і ўзбуйненне старых протагарадскіх племянных цэнтраў. Менавіта гарады XI ст. становяцца асяродкам і засяроджваннем вярхоўнай княжацкай улады, якая карыстаецца падтрымкай гарадскіх палітычных эліт і шырокіх колаў грамадства. Адбываецца канчатковая славянізацыя Рурыкавічаў, што спрыяла ўваходжанню іх у мясцовае грамадства. За князем замацоўваецца статус вярхоўнага ўладара сваёй зямлі, гаранта абароны кнства ад знешняй бяспекі і ахоўніка ўнутранага міру.

З развіццём княжацкай улады адбываецца ўдасканальванне яе функцый, паступовае афармленне княжацкага апарату кіравання. Важнай з'явай у палітыцы кіеўскага князя Уладзіміра з'яўляецца пабудова парубежных гарадоў-крэпасцей, якія засяляюцца разнаэтнічным насельніцвам з іншых рэгіёнаў Усходняй Еўропы. Пачынаючы з Уладзіміра, старажытнарускія князі выкарыстоўваюць скандынаваў

ужо не ў якасці пастаянных дружын, а галоўным чынам як наёмнае войска. Паказальнай у гэтым выпадку з'яўляецца адпраўка скандынаваў на перыферыю, магчыма ў якасці княжацкіх намеснікаў і праваднікоў княжацкага кіраўніцтва. Дакладна вядома, што першым князем, які гэта зрабіў, быў Уладзімір Святаславіч. Можна меркаваць, што падобная практыка выкарыстоўвалася полацкімі князямі XI ст. пры засваенні і дзяржаўнай каланізацыі балцкіх зямель.

Адной з важнейшых падзей у гісторыі старажытнарускіх зямель стала афіцыйнае прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства. З распаўсюджваннем монатэістычнай хрысціянскай рэлігіі адбываецца канчатковая лігітымізацыя княжацкай улады ў падуладным грамадстве. З прыняццем хрысціянства княжацкая ўлада пераходзіць на якасна новы ўзровень. Умацаванню дзяржаўнасці і міждзяржаўным кантактам спрыяе ўсталяванне дынастычных шлюбаў рускіх князёў з іншымі ўладарамі хрысціянскіх краін. Кіеўскае княства і Полацкая зямля пасля афіцыйнай хрысціянізацыі актыўна пераймаюць візантыйскія культурныя і ідэйна-палітычныя ўзоры, што дазваляе маладым усходнееўрапейскім княствам на чале з уласнымі княжацкімі дынастыямі будаваць уласныя формы і рэпрызентацыі ўлады.

Такім чынам, на мяжы X і XI стст. на тэрыторыі Усходняй Еўропы фарміруецца дзяржава з цэнтрам у Кіеве. Правячая роля ў дадзенай дзяржаве замацоўваецца за дынастыяй Рурыкавічаў. Адначасова адбываецца афармленне дынастыі Рагвалодавічаў у Полацкай зямлі, што з'яўляецца асноўным маркерам вылучэння гэтага княства. На тэрыторыях утвораных дзяржаў-княстваў паступова сціраюцца былыя этнічныя межы, а самі дзяржаўныя ўтварэнні на чале з вярхоўнай княжацкай уладай выступаюць у ролі своеасаблівага "плавільнага катла", фарміруючы адзіную сацыяльна-палітычную, эканамічную і культурную прастору пад кіраўніцтвам уласных дынастый. Ідэалагічнай асновай дзяржаўных аб'яднанняў становіцца хрысціянская царква.

ЛІТАРАТУРА

1. Темушев, С. Н. Начало Руси: генезис государственности в источниках и исторической традиции : пособие для студентов ист. фак. спец. 1-21 03 01 «История (по направлениям)» / С. Н. Темушев. – Минск : БГУ, 2008. – 159 с.
2. Темушев, С. Н. Роль правящих династий в развитии ранних славянских государств / С.Н. Темушев // Ранние государства Европы и Азии: проблемы политогенеза : XXIII чтения памяти члена-корреспондента АН СССР Владимира Терентьевича Пашуто, Москва, 19–21 апреля 2011 г. / Ин- всеобщей истории РАН. – М., 2011. – С. 278–282.
3. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапаможнік : у 2 ч. / Я. А. Юхо. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 1. – 352 с.
4. Штыхаў, Г. В. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі : дадатак да часопіса "Права і эканоміка"/ Г. В. Штыхаў. – Мінск, 1999. – 76 с. – (Серыя "Гісторыя Бацькаўшчыны").
5. Толочко, О. П. Русь: Держава і образ держави / О.П. Толочко. – Київ : Ін-т історії НАН України, 1994. – 37 с.
6. Фроянов, И. Я. Киевская Русь: Главные черты социально-экономического строя / И. Я. Фроянов. – СПб. : Изд-во С-Петербургского университета, 1999. – 372 с.
7. Новікаў, Я. У. Ваенная гісторыя беларускіх земляў (да канца XII ст.). / Я. Новікаў. – Мінск : Логвінаў, 2008. – Т. 2. – 300 с.
8. Słupecki, L. From Tribal Structures To early states in medieval Europe and what caused the change – criminal background? / Leszek Słupecki // Древняя Русь и средневековая Европа: возникновение государств : материалы междунар. Конф., Москва, 2012 г. / Ин-т всеобщей истории РАН. – М., 2012. – С. 248–250.
9. Ловмяньски, Х. Русь и норманны / Х. Ловмяньский ; пер. с пол. ; общ. ред.: В. Т. Пашуто [и др.]. – М. : Прогресс, 1985. – 304 с.
10. Сергеевич В. И. Лекции и исследования по древней истории русского права / В. И. Сергеевич. – 2-е изд., доп. – СПб. : Типография М. М. Стасюкевича, 1899. – VI. – 480 с.
11. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – М. : Изд-во Академии наук СССР, 1950. – 576 с.
12. Кежа, Ю. М. Да пытання аб станаўленні ўлады Рагвалодавічаў у Полацку / Ю. М. Кежа // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. II міжнар. навук. канф., Полацк, 17–18 красав. 2014 г. : у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача, С.А. Шыдлоўскага. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – Ч. 2. – С. 92–100.
13. Дук, Д. В. Новые археологические исследования на территории Заполоцкого посада древнего Полоцка / Д. В. Дук, А. Л. Коц // Stratum. – 2013. – № 5. – С. 83–90.
14. Полное собрание русских летописей. – Ленинград : Изд-во Академии наук СССР, 1926–1928. – Т. 1 Лаврентьевская летопись. – 379 с.
15. Мельникова, Е. А. Скандинавы в процессах образования Древнерусского государства / Е. А. Мельникова // Древняя Русь и Скандинавия : избр. труды. – М. : Русский Фонд Содействию образования и Науке, 2011. – С. 49–72.
16. Мельникова, Е. А. Происхождение правящей династии в раннесредневековой историографии. Легитимизация иноэтнической знати / Е. А. Мельникова // Древняя Русь и Скандинавия : избр. труды. – М. : Русский Фонд Содействию образования и Науке, 2011. – С. 109–113.
17. Слово о Законе и Благодати митрополита Илариона [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4868 . Дата доступу: 15.12.2013.

18. Сказание о Борисе и Глебе [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4871. Дата доступу: 07.02.2013.
19. Толочко, П. П. Древнерусский феодальный город / П. П. Толочко / АН УССР, Ин-т археологии ; отв. ред. С. А. Высоцкий. – Киев : Наук. думка, 1089. – 256 с.
20. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – Т. 1 Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 351 с.
21. Носов, Е. У истоков Руси и Новгорода / Е. Носов // Родина. – 2012. – № 9. – С. 40–43.
22. Каретников, А. Л. Включение племенной территории мери в состав Древнерусского государства / А. Л. Каретников // Древняя Русь и средневековая Европа: возникновение государств: материалы междуна. конф., Москва, 2012 г. / Ин-т всеобщей истории РАН. – М., 2012. – С. 81–89.
23. Еонисова Н. В. Гнёздово – раннегородской центр эпохи формирования древнерусского государства / Н. В. Еонисова, Т. А. Пушкина // Древняя Русь и средневековая Европа: возникновение государств : материалы междунар. конф., Москва, 2012 г. / Ин-т всеобщей истории РАН. – М., 2012. – С. 55–62.
24. Русь в IX–XI веках : археологическая панорама / Ин-т археологии РАН ; отв. ред. Н. А. Макаров. – М. ; Вологда : Древности Севера, 2012. – 496 с.
25. Макушников, О. А. Гомельское Поднепровье в V – середине XIII вв.: социально - экономическое и этнокультурное развитие : моногр. / О. А. Макушников. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2009. – 218 с.
26. Мельникова, Е. А. Возникновение древнерусского государства в североевропейской пераспективе / Е. А. Мельникова // Древняя Русь и средневековая Европа: возникновение государств, материалы междунар. конф., Москва, 2012 г. / Ин-т всеобщей истории РАН. – М., 2012. – С. 156–161.
27. Мельникова Е. А. Формирование сети раннегородских центров и становление государства (Древняя Русь и Скандинавия) / Е. А. Мельникова, В. Я. Петрухин // Древняя Русь и Скандинавия : избр. труды. – М. : Русский Фонд Содействию образования и Науке, 2011. – С. 82–100.
28. Сванидзе, А. А. Средневековые города Северной Европы [Электронный ресурс] / А.А. Сванидзе. – Режим доступа: http://norse.ulver.com/svanidze/medievaltowns.html. – Дата доступа: 12.10. 2014.
29. Флори, Ж. Идеология меча. Предистория рыцарства / Ж. Флори ; пер. с. фр. – СПб. : Евразия, 1999. – 314 с.
30. Куза, А. В. Древнерусские поселения / А. В. Куза // Древняя Русь. Город, замок, село / Археология СССР. – М. : Наука, 1985. – С. 39–135.
31. Тихомиров, М. Н. Древнерусские города / М. Н. Тихомиров. – М. : Государственное издательство политической литературы, 1956. – 478 с.
32. Янин, В. Л. Основные итоги археологического изучения Новгорода / В. Л. Янин // Труды VI Международного Конгреса славянской археологии. – М., 1997. – Т. 2 : Славянский средневековый город. – С. 6–12.
33. Алексеев, Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. / Л. В. Алексеев. – М. : Наука, 1980. – 260 с.
34. Жаров, Г. В. Исследования на территории древнего Чернигова [Электронный ресурс] / Г. В. Жаров, Т. Н. Жарова. – Режім доступа: http://archeology.narod.ru/book6.htm. – Дата доступа: 15.10. 2014.
35. Urbańczyk, P. Trudne początki Polski / P. Urbańczyk. – Wrocław : Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego, 2008. – 420 s.
36. Семянчук, Г. Генезіс беларускіх гарадоў у ранім сэрэднявеччы (IX–XIII стст.) / Г. Семянчук // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі. – Гродна, 2009. – С. 10–23.
37. Темушев, С. Н К вопросу об истоках политической самостоятельности Полоцкой земли в древнерусский период / С. Н. Темушев //Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы міжнар. навук. канф., Полацк, 22–23 мая 2012 г. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі, Полац. дзярж. ун-т ; навук. рэд., уклад. В. М. Ляўко – Мінск, 2012. – С. 39–51.
38. Дук, Д. Полоцку – 1150: истоки государственности на белорусских землях / Д. Дук // Родина. – 2012. –№ 9. – С. 66–69.
39. Тимощук, Б. А. Восточные славяне: от общины к городам / Б. А. Тимощук / отв. ред. С. А. Плетнёва. – М. : Изд-во МГУ, 1995. – 261 с.
40. Дук, Д. У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с.
41. Дук, Д. У. Да вынікаў археалагічных раскопак на Запалоцкім пасадзе старажыінага Полацка ў 2004 г. / Д. У. Дук // Археалагічны зборнік / Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі ; уклад. М. А. Плавінскі, В. М. Сідаровіч. – Мінск : Юніпак, 2006. – Вып. 1. – С. 52–57.
42. Дук, Д. Древо жизни Полоцкого городища / Д. Дук // Родина. – 2007. – № 10. – С. 37–39.
43. Фроянов, И. Я. Города – государства Древней Руси / И. Я. Фроянов, А. Ю. Дворниченко. – Л. : Издательство С-Петербургского ун-та, 1988. – 269 с.
44. Лысенко, П. Ф. Туровская земля IX–XIII вв. / П. Ф. Лысенко. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – 268 с.
45. Свердлов, М. Б. Домонгольская Русь: Князь и княжеская власть на Руси VI – первой трети XIII вв. / М. Б. Свердлов. – СПб. : Академический проект, 2003 – 736 с.
46. Мейерович, М. Г. Так начинался Ярославль / М. Г. Мейерович. – Ярославль : Верхне-Волжское книжное издательство, 1984. – 135 с.
47. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц. – Мінсг: Навука і тэхніка, 1995. – 207 с.
48. Археалогія Беларусі : у 4 т. / Я. Г. Звяруга, Т. М. Каробушкіна, П. Ф. Лысенка, Г. В. Штыхаў ; навук. рэд. П. Ф. Лысенка. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – Т. 3. Сярэдневяковы перыяд (IX – XIII стст). – 554 с.
49. Татищев, В. Н. История Российска / В. Н. Татищев. – М. : ЭКСМО, 2006. – 736 с.
50. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л – Я. – 464 с.
51. Дучыц, Л. Маскавічы / Л. Дучыц // Полацкі летапісец. – 1993. – № 1(2) – С. 13–18.

52. Катлярчук, А. Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў = Svenskar i vitrysk historia och kultur / А. Катлярчук. – 2- е выд., папраўл. і дап. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2007. – 303 с.
53. Прядь об Эймунде Хрингссоне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://norse.ulver.com/src/konung/eymund/ru2.html. – Дата доступу: 15.12.2013.
54. Литаврин, Г. Г. Византия, Болгария, Древняя Русь (IX – начало XII в.) / Г. Г. Литаврин. – СПб. : Алетейя, 2000. – 418 с.
55. Голубинский, Е. История русской церкви / Е. Голубинский. – изд. 2-е, испр. и доп. – М. : Университетская типография, 1901. – Т. 1. – Период первый, киевский или домонгольский. – 968 с.
56. История средних веков : учеб. пособие : в 3 ч. / В. А. Федосик [и др.] ; под ред. В. А. Федосика, И. О. Евтухова. – Минск : изд. центр БГУ, 2008. – Ч 1. Раннее средневековье. – 255 с.
57. Канстанцін Баграянародный Об управлении империей [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.vostlit.info/Texts/rus11/Konst_Bagr_2/index.phtml?id. – Дата доступу: 13.10.2013.
58. Данилевский И. Н. Древняя Русь глазами современников и потомков (IX–XII стст.) / И. Н. Данилевский. – М. : Аспект пресс, 1998. – 205 с.
59. Сванидзе, А. А. Викинги – люди саги: жизнь и нравы / А. А. Сванидзе. – М. : Новое литературное обозрение, 2014. – 800 с.
60. Сага о крещении [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://norse.ulver.com/src/biskup/kristni/ru2.html. – Дата доступу: 12.10.2014.
61. Полное собрание русских летописей. – СПб. : Типография И.Н. Скороходова, 1904. – Т. 13 Летописный сборник именуемый Патриаршей или Никоновской летописью. – 308 с.
62. Приселков, М. Д. Троицкая летопись. Реконструкция текста / М. Д. Приселков. – М. : изд-во АН СССР, 1950. – 518 с.
63. Дук, Д. У. Гісторыя Полацка : па матэрыялах археалагічных даследаванняў : вучэб.-метад. комплекс для студ. спец. 1-21 03 01-01 01, 1-02 01 02-04 / Д. У Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 112 с.
64. Раппопорт, П. А. Русская архитектура X–XIII вв. Католог памятников. Археология СССР. Свод археологических источников / П.А. Раппопорт. – Л. : Наука, 1982. – Вып. Е 1–47. – 136 с.
65. Фроянов, И. Я. Начала русской истории / И. Я. Фроянов. – М. : изд. дом “Парад”, 2001. – 975 с.
66. Загорульский, Э. М. Белая Русь с середины I тысячелетия до середины XIII века / Э. М. Загорульский ; вступ. ст. В. А. Тепловой. – Изд. 2-е, доп. – Минск : Четыре четверти, 2014. – 532 с.
67. Прохараў, А. Тураў / А. Прохараў, С. Санько // Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 479–481.


*Паступіў 09.09.2015*

## THE FORMATION OF THE EARLY MEDIEVAL STATE FORMATION ON THE LANDS OF EASTERN EUROPE (COMMON FEATURES)

***J. KEZHA***

*The article analyzes the main factors of statehood on the lands of Eastern Europe (the end of X - the beginning of XI c.). On the territory of states formed by former tribal boundaries disappear, as do public education led by the supreme power of the prince's act as a "melting pot", forming a single socio-political, economic, and cultural space under the rule of their own dynasties. The ideological basis of the new state formations became the Christian church.*

***Keywords**: state formation, the princely power, Christianity, cultural space.*